## ОБЗОРЫ И РЕЦЕНЗИИ

# МЕСЦЫ ЗЛАЧЫНСТВАЎ "КАНЧАТКОВАГА РАШЭННЯ": МІНСКАЕ ГЕТА І МАЛЫ ТРАСЦЯНЕЦ

P. Rentrop Tatorte der „Endlösung“. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostenez / P. Rentrop. – Berlin : Metropol Verl., 2011. – 256 S.

Нямецкая праца прысвечана вывучэнню гісторыі Мінскага гета і Малога Трасцянца. Кніга выйшла з-пад пяра Петры Рэнтрап – дактаранткі Цэнтра па даследаванні антысемітызму Тэхнічнага ўніверсітэта Берліна.

Структура кнігі ўключае прадмову, 6 частак (падзеленых на раздзелы і падраздзелы), заключэнне, спіс крыніц, літаратуры і асабістых імёнаў.

У "Прадмове" (с. 7–15) даследчыца вызначае галоўным напрамкам свайго пошуку паказ рэальнага месца Мінска і яго ваколіц як аднаго з "самых вялікіх лагераў смерці для еўрапейскіх яўрэяў" (с. 8) у структуры нацыянал-сацыялісцкага "канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання".

Праца абапіраецца не толькі на новыя гістарыяграфічныя, але і на маловядомыя дакументальныя крыніцы, выяўленыя ў шэрагу архіваў Аўстрыі, Беларусі, Германіі, ЗША. Для правядзення дэталёвай рэканструкцыі працэсу вынішчэння яўрэяў у Мінскім гета і ў Малым Трасцянцы аўтар звяртаецца да матэрыялаў пасляваенных судовых працэсаў, а таксама ўспамінаў былых вязняў Мінскага гета і Малога Трасцянца (с. 14).

У першай частцы кнігі – «Нацысцкая "яўрэйская палітыка" да 1939/40 гг.» (с. 17–37) – аўтар прадстаўляе аналіз нацыянал-сацыялісцкай "яўрэйскай палітыкі" да пачатку вайны супраць СССР. На аснове выкарыстання шырокіх дакументальных крыніц зроблена выснова, што пасля нападу Германіі на Польшчу пачаўся пераход ад ідэі выгнання яўрэяў да іх поўнага вынішчэння (с. 36). Пасля паражэння Францыі на Захадзе гэта азначала для Гітлера пачатак падрыхтоўкі ваеннай аперацыі на ўсходзе.

У другой частцы працы «Аперацыя "Барбароса" і "яўрэйскае пытанне"» (с. 39–55) раскрыты характар будучага процістаяння нацыянал-сацыялісцкай Германіі і бальшавіцкага СССР. Беларусь разглядалася як "другі яўрэйскі рэзервуар", які яе лічылі пасля генерал-губернатарства. Перасяленне яўрэяў на поўдзень Беларусі для асушэння прыпяцкіх балот магло значна скараціць яўрэйскае насельніцтва (с. 53).

У трэцяй частцы даследавання "Пачатак праследу яўрэяў у Мінску" (с. 57–98) паказаны ход правядзення вайны на вынішчэнне на прыкладзе Мінска, які з моманту захопу знаходзіўся ў сферы дзейнасці розных службаў, у тым ліку ваеннай адміністрацыі. Паводле загада ваеннай палявой камендатуры № 812 ад 19 ліпеня 1941 г., вылучаліся 40 вуліц, дзе загадвалася стварыць "жылы раён" для перасялення 60 тысяч яўрэяў горада (с. 65). У пачатку гэтай часткі даследчыца прыводзіць лічбы адносна

колькасці яўрэяў, якія пражывалі на пачатак вайны ў Мінску, ведучы падлікі на аснове 240 тысяч чалавек, трэць ад якіх (ці 70998 чалавек) складалі яўрэі (с. 58). На наш погляд, згаданыя падлікі грунтуюцца на статыстычных дадзеных 1939 г., тады як у пачатку студзеня 1941 г. ў Мінску пражывалі каля 300 тысяч чалавек (Пашпарт горада // Звязда. – 1941. – 5 студзеня). Таму доля яўрэйскага насельніцтва на пачатак вайны стала меншай, чым была ў 1939 г.

Аналіз новых фактаў, датычных вынішчэння яўрэяў з моманту захопу горада, пераконвае ў тым, што масавыя забойствы мірных жыхароў яўрэйскага паходжання пачаліся з першых дзён акупацыі Мінска. Прынцыпова важным нам бачыцца тое, што даследчыца па-новаму разглядае дэпартацыю 25 тысяч еўрапейскіх яўрэяў у Мінск. У дачыненні да Магілёва аўтар кнігі зазначае, што стварэнне такога цэнтра планавалі на тэрыторыі металаапрацоўчага завода імя Г.Дзімітрова: там намячалі стацыянарна размясціць 32 крэмацыйныя печы для спальвання штодзённа да 3 тысяч трупаў. Аднак далейшыя падзеі на Усходнім фронце ўнеслі істотныя змены і крэмацыйныя печы былі адпраўлены ў Асвенцім (с. 97).

У лістападзе 1941 г. пачалася дастаўка першых эшалонаў з нямецкімі яўрэямі ў Мінскае гета, дзе былі створаны два "зондэргета" для размяшчэння яўрэяў, дэпартаваных з Гамбурга, Дзюсельдорфа, Франкфурта-на-Майне, Берліна, Вруна, Брэмена і Вены. З красавіка 1942 г. непасрэдна ў самой вёсцы Малы Трасцянец быў арганізаваны працоўны лагер, у жніўні непадалёку ад яго была абсталявана часовая чыгуначная платформа. Для нямецкай даследчыцы ў гэтым пытанні пераканаўчай з'яўляецца думка пра тое, што пастаўлены на паток працэс масавых забойстваў еўрапейскіх яўрэяў бярэ свой пачатак толькі вясной 1942 г. Мінск стаў у гэтым працэсе вельмі важнай арэнай для правядзення эксперымента (с. 98).

У чацвёртай частцы кнігі «Мінскае гета паміж "яўрэйскай палітыкай" і канчатковым вынішчэннем (1941–1943)» (с. 99–158) паказаны шэраг важных гістарычных аспектаў паўсядзённасці вязняў Мінскага гета. Ахову Мінскага гета забяспечвалі 46-ы, 47-ы і 48-ы ўкраінскія ахоўныя батальёны, а таксама літоўскія і латышскія дапаможныя сілы з айнзацгруп (с. 113).

Раскрываючы ўмовы знаходжання яўрэяў у Мінскім гета, даследчыца паказвае абставіны іх выжывання ў поўнай ізаляцыі пры фактычнай адсутнасці харчавання і абмежаванай медыцынскай дапамозе. З восені 1941 г. вязні Мінскага гета працавалі на былой фабрыцы "Кастрычнік", на фірме "Трэвіц", ва ўнівермагу "Троль і Ко", у будаўнічай фірме "Бендкоўскі", у рамонтных майстэрнях люфтвафэ і на радыёзаводзе, на ўзвядзенні рамонтных майстэрняў "Верлін-Вэрк". Яўрэі выкарыстоўваліся дырэкцыяй Імперскай чыгункі "Цэнтр" у Мінску, у невялікіх прадпрыемствах вермахта, у нямецкіх лазарэтах, салдацкіх інтэрнатах, на складах, у рамонтных майстэрнях, у майстэрнях па рамонце ўзбраенняў і артылерыйскіх прылад. Яўрэі працавалі на розных будаўнічых пляцоўках арганізацыі Тодта, у рэдакцыі "Мінскай газеты" і ў бібліятэцы Мінскай акругі і інш. (с. 129).

З лістапада 1941 г. на тэрыторыі гета пачаліся пагромы, у час якіх у пераліку ахвяр значыліся жанчыны, дзеці, людзі сталага ўзросту і слабыя фізічна яўрэі. Гэтым "першая вялікай акцыя" адрознівалася ад аблавы, праве-

дзенай у жніўні, калі ў лік ахвяр патрапілі мужчыны, у першую чаргу ваеннаабавязанага ўзросту (с. 141). Даследчыца ў працы ўдзяляе ўвагу асноўным этапам вынішчэння яўрэяў Мінскага гета ў ходзе аблаў і пагромаў, раскрываючы іх маштабы на прыкладзе правядзення "вялікай акцыі" 2–3 сакавіка 1942 г., 28–29 ліпеня 1942 г. і 21–23 кастрычніка 1943 г. З лета 1942 г. ішла ліквідацыя яўрэяў з Берліна, Бруна, Брэмена і Вены (с. 148).

У працы разглядаюцца стратэгіі выжывання і супраціўлення яўрэяў у Мінску. Аўтар падкрэслівае, што вязні Мінскага гета не чакалі свайго лёсу, а вялі пастаянную барацьбу супраць германскіх захопнікаў. Дзякуючы ўцёкам удалося выратавацца амаль 3 тысячам беларускіх яўрэяў.

У пятай частцы працы "Нямецкія яўрэі ў Мінскім гета" (с. 159–184) аўтар распавядае пра лёс еўрапейскіх яўрэяў, якія былі дэпартаваны ў Мінск на працягу 1941–1942 гг. Да канца 1941 г. ў напрамку Мінска з Германіі і Аўстрыі былі адпраўлены 7 эшалонаў, якія даставілі ў сталіцу Беларусі 6937 яўрэяў з Гамбурга, Дзюсельдорфа, Франкфурта-на-Майне, Берліна, Бруна, Гамбурга, Брэмена і Вены. Першы эшалон перасяленцаў прыбыў з гамбургскімі яўрэямі ў Мінск 11 лістапада 1941 г. Яўрэі размяшчаліся ў "Зондэргета 1" і "Зондэргета 2" (с. 178), выкарыстоўваліся ў гаспадарцы камандзіра паліцыі бяспекі і СД у Малым Трасцянцы.

У шостай частцы даследавання "Малы Трасцянец (1942–1944)" (с. 185–227) аўтар аднаўляе карціну гісторыі Малога Трасцянца, вядомага з айчыннай гістарычнай літаратуры пад дэфініцыяй "Трасцянецкі лагер смерці" і прапануе карыстацца тэрмінамі *працоўны лагер Малы Трасцянец* і *месцы вынішчэння мінскай паліцыі бяспекі ў раёне Малога Трасцянца*.

Паводле наяўных дакументальных крыніц бачна, што працоўны лагер Малы Трасцянец узнікае ў канцы красавіка 1942 г. (с. 186). Ва ўрочышчы Благаўшчына першы расстрэл амаль 1 тыс. венскіх яўрэяў адбываецца 11 мая з удзелам мінскай паліцыі бяспекі і СД разам з мясцовымі памагатымі. Новым словам у даследаванні з'яўляецца думка пра тое, што менавіта дэпартацыя яўрэяў у напрамку Мінска з'яўлялася не толькі важнай, колькі вызначальнай умовай для стварэння Малога Трасцянца, які трапляе ў фокус пошуку камандзіра паліцыі бяспекі і СД у Мінску. У вырашальнай ступені такому рашэнню садзейнічаў той факт, што зусім непадалёку ад месца вынішчэння праходзіла чыгуначная ветка (с. 198).

Аўтар, кажучы пра стварэнне часовай платформы "побач [nahe Kolodisci] з Калодзішчамі", не зусім дакладна лакалізуе месца знаходжання самой платформы. Паводле дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі "Цэнтр" у Мінску, гэтым месцам з'яўляўся шосты кіламетр на ўчастку веткі Калодзішчы–Міханавічы (Карта Генерального штаба Красной армии № 35–80 (Минск), 1933 г. // Лагерь смерти Тростенец. – Минск, 2003. – Дадатак). Да, таго ж у спасылцы даследчыца памылкова ўказвае аркуш 1 (НА РБ. – Фонд 378. – Воп. 1. – Спр. 508. – Арк. 13). Кажучы аб дакументах, адпаведна якім праводзілася дэпартацыя еўрапейскіх яўрэяў ў Малы Трасцянец праз станцыю Калодзішчы, гісторыку важна было б звярнуць увагу на назву спецыяльных транспартаў, якія называліся "спецпаяздамі для перасяленцаў, сезонных рабочых і яўрэяў" (НА РБ. – Фонд 378. – Воп. 1. – Спр. 508. – Арк. 28).

Гісторык раскрывае асноўныя этапы правядзення масавых забойстваў дэпартаваных яўрэяў: з 11 мая па 9 кастрычніка 1942 г. ў Мінск і Малы Трасцянец прыбылі 16 саставаў з дэпартаванымі яўрэямі, з якіх 9 – з Вены, 5 – з Тэрэзіенштадта, і па адным – з Кёнігсберга і Кёльна. Яўрэі, адпраўленыя спачатку ў пасажырскіх вагонах, пачынаючы з Ваўкавыска, дастаўляліся да Мінска ці ў Малы Трасцянец у вагонах для перавозкі жывёлы (грузаў). Дастаўка яўрэяў ад часовай платформы да месца расстрэлу адбывалася таксама з выкарыстаннем грузавых аўтамашын і газавых фургонаў (с. 208).

Разглядаючы гісторыю Малога Трасцянца, даследчыца зыходзіць з таго факта, што такая назва можа ўжывацца да працоўнага лагера ў гаспадарцы камандзіра мінскай паліцыі бяспекі і СД. Яго стварэнне звязана з вязнямі мінскай турмы, адкуль спачатку былі адабраны каля 20 беларусаў, якія разам з жыхарамі вёскі Малы Трасцянец пачалі будаўнічыя работы на тэрыторыі гаспадаркі былога калгаса імя Карла Маркса. Пасля стварэння гаспадаркі камандзіра мінскай паліцыі бяспекі і СД на тэрыторыі працоўнага лагера вяліся значныя работы з мэтай пабудовы жылых і рабочых памяшканняў, у якіх адкрываліся розныя майстэрні. Вязні лагера працавалі ад 12 да 15 гадзін у сталярнай майстэрні, у цэху па вырабу мэблі, у кузні, швейнай майстэрні, пральні, майстэрні па вырабе чаравікаў, у бандарні, скарняцкай майстэрні і вялікім садзе. Хто не мог працаваць, нёс смяротнае пакаранне.

У пачатку 1944 г. непадалёку ад гаспадаркі ва ўрочышчы Шашкоўка быў створаны часовы крэматорый, які ў кнізе названы як месца знішчэння (с. 223). Там знішчалася неяўрэйскае насельніцтва, захопленае ў ходзе карных аперацый супраць савецкіх партызан. У ліку апошніх ахвярамі сталі былыя вязні гаспадаркі Малы Трасцянец, якія былі знішчаны разам з вязнямі мінскай турмы і зборнага лагера на вуліцы Шырокай. Месцам знішчэння стаў хлеў на тэрыторыі гаспадаркі. Агульная лічба тых, хто быў знішчаны каля Малога Трасцянца, складае каля 60 тысяч чалавек. У манаграфіі адзначана, што ў месцы знішчэння ва ўрочышчы Благаўшчына ахвярамі з’яўляліся галоўным чынам еўрапейскія яўрэі (с. 227). Больш дакладныя падлікі на аснове вядомых на цяперашні час дакументаў пакуль немагчымы ў дачыненні да ўсіх знішчаных ахвяр. Усяго з амаль 23 тысяч дэпартаваных у Мінск і Малы Трасцянец удалося выратавацца толькі 75 еўрапейскім яўрэям.

Пры звароце даследчыцы да дакументальнай крыніцы, копію якой яна выявіла ў архіве Мемарыяльнага музея халакосту ў Вашынгтоне, П. Рэнтрап памылкова называе старшыню Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі СССР “лейтэнантам Мікалаем Бурдэнка”. На наш погляд, размова ідзе пра акадэміка генерал-лейтэнанта Мікалая Нілавіча Бурдэнка, які ўзначальваў гэту камісію ў Мінску.

Нягледзячы на асобныя недахопы, новая праца нямецкага гісторыка П. Рэнтрап з’яўляецца важным укладам у даследаванне трагічнай гісторыі Мінскага гета і Малога Трасцянца. Несумненнай заслугай даследчыцы можна лічыць удалую спробу па глыбокім навуковым асэнсаванні малавядомых і пакуль неадназначных падзей гісторыі не толькі беларускага, але і яўрэйскага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

*С.Я. Новікаў*

*Поступила в редакцию 13.02.12*